**“Мой родны кут, як ты мне мілы...”**

**Мэта**: удакладніць і пашырыць веды аб Дзяржаўных сімвалах Беларусі, фарміраваць інтарэс да жыцця і творчасці беларускіх паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа; узбагачаць лексічны запас вучняў, развіваць кемлівасць, дапытлівасць, творчыя здольнасці дзяцей; выхоўваць любоў да Радзімы, павагу да славутых яе сыноў.

**Ход урока**

1. **Арганізацыя пачатку ўрока.**
2. **Паведамленне тэмы ўрока.**

--Як вы думаеце, аб чым пойдзе гаворка на першым у гэтыя навучальным годзе ўроку?

**3. Беларусь—мая Радзіма.**

--*Што такое Бацькаўшчына, знаеш?*
--*Гэта рэчка, сцежачка лясная,*
*гэта ў лузе залатая пчолка, а ў вачах тваіх—*
*вясёлка.*
--*Бацькаўшчына—*
*гэта дом твой, школа,*
*гэта песні, што звіняць наўкола... (А.Касцюшка*)

--Што мы называем сваёй Бацькаўшчынай?
--Вось яна! Нібы кляновы лісток—наша Беларусь. Рэспубліка Беларусь—незалежная, суверэнная дзяржава. Хто ведае, колькі абласцей уваходзяць у склад Беларусі? Назавіце іх.

Як і ўсе незалежныя дзяржавы, Беларусь мае Дзяржаўныя сімвалы. Назавіце іх. Дзе вы маглі бачыць герб і сцяг Рэспублікі Беларусь? Як патрэбна адносіцца да Дзяржаўных сімвалаў нашай краіны?

Разгадванне крыжаванкі “Мая Радзіма—Беларусь”. (часопіс “ПШ” )
1,3,4.Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь.(Гімн, сцяг, герб.)
2. Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь.(Канстытуцыя.)
5. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. (Лукашэнка.)
6,8,12,14,17,18. Вобласці Рэспублікі Беларусь.(Гродзенская, Мінская, Віцебская, Магілёўская, Брэсцкая, Гомельская.)
7. Хто за...гарой, той сапраўдны герой.(Радзіму).
9. Сталіца Рэспублікі Беларусь. (Мінск.)
10. Беларусь—край блакітных... (Азёр.)
11. Беларусь дасталася нам ад нашых Бацькоў. А ім ад іхніх бацькоў—нашых дзядоў. Таму Беларусь называюць... (Бацькаўшчынай.)
13, 16. Вядомыя беларускія пісьменнікі. (Колас, Купала)
15. Беларускі першадрукар. (Скарына.)

**4. Янка Купала і Якуб Колас—песняры Беларусі.**

Сёлета адзначаецца 125 год з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа. Імёны гэтых паэтаў ведае кожны беларус. Яны неаддзельны ад роднай мовы, ад нашай беларускй зямлі. Неўміручыя вершы паэтаў, пакладзеныя на музыку, атрымалі новае жыццё.Зараз мы нагадаем аб жыцці і творчасці гэтых славутых паэтаў. Вы падзеліцеся на дзве групы: першая будзе рыхтаваць расказ аб

Я.Купалу, другая—Я.Коласу. Кожны вучань прыгожа прачытае кароткі ўрывак з гэтага расказа. Затым мы праверым свае веды: будзем адказваць на пытанні аб праслуханым.

1) Сапраўднае імя Янкі Купалы Іван Дамінікавіч Луцэвіч. Нарадзіўся ён у вёсцы Вязынка ў сям'і арандатара. Арандатар—гэта чалавек, які бярэ зямлю ў карыстанне за пэўную плату, працуе на ёй, абрабляе, але гэта зямля не з'яўляецца яго ўласнасцю.
2) У ноч з 6 на 7 ліпеня адзначаецца свята Купалле. Іменна ў гэту ноч і нарадзіўся Іван Дамінікавіч Луцэвіч. Пазней, калі паэту спатрэбіўся псеўданім, ён выбраў гэты—Янка Купала.
3) У сямігадовым узросце Янка пайшоў у школу. Вучыўся Іван з задавальненнем і вялікім жаданнем.
4) Пасля заканчэння народнага вучылішча будучы паэт пачаў працаваць. Быў ён і хатнім настаўнікам, і перапісчыкам ў судовага следчага, і бібліятэкарам.
5) Першы верш Янкі Купалы называўся "Мужык". Яго творы друкаваліся ў розных беларускіх газетах і часопісах. Выйшаў першы зборнік вершаў "Жалейка".
6) Разам з Якубам Коласам Янка Купала стаў заснавальнікам Інстытута беларускай культуры. Яму было прысвоена званне народнага паэта Беларусі. Пазней Янка Купала быў абраны акадэмікам Акадэміі навук Беларусі.

Бачу, вы ўважліва слухалі выступленні вучняў 1-й групы, таму адказаць на пытанні вам будзе нескладана.

Пытанні:

1) Якое сапраўднае імя Янкі Купалы?
2) Чаму ён выбраў сабе такі псеўданім?
3) Дзе нарадзіўся паэт?
4) З якой ён сям'і?
5) Як набываў адукацыю Іван Дамінікавіч?
6) Якім ён быў у дзяцінстве?

А зараз паслухаем выступленні другой групы вучняў. Яны нам раскажуць пра Якуба Коласа. Дарэчы, іменна словамі з паэмы Якуба Коласа "Новая зямля" названы наш урок.

1) Якуб Колас—гэта псеўданім паэта. Яго сапраўднае імя—Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. Нарадзіўся ён непадалёку ад Стоўбцаў у сям'і селяніна, які служыў лесніком у князя Радзівіла.

2) Раннія дзіцячыя гады прайшлі ў лесніковых сядзібах Ласток і Альбуць, што недалёка ад вёскі Мікалаеўшчыны.

3) У гэтым маляўнічым краі праходзілі маленства і юнацтва паэта. Тут упершыню адчуў ён гора народа, тут нарадзілася яго любоў да роднай зямлі. Свае дзіцячыя гады Якуб Колас апісаў у паэме "Новая зямля".

4) Рана абудзілася ў хлопчыка цікавасць да кнігі. Пачатковую грамату ён набываў дома з дапамогай "дарэктара", вясковага хлопца, які меў не надта багатыя веды. Пасля два гады вучыўся ў народнай школе вёскі Мікалаеўшчыны. Школа і кнігі прыносілі Кастусю шмат радасці. Кастанцін Міхайлавіч скончыў настаўніцкую семінарыю, бо з дзяцінства марыў стаць настаўнікам.

5) Пісаць вершы пачаў у дванаццацігадовым узросце. Калі Кастусь прачытаў адзін са сваіх першых вершаў "Вясна" бацьку, той сказаў: "Добра,"—пацалаваў сына і даў яму рубель.

6) Колас любіў паэзію, усе вольныя хвіліны аддаваў літаратурнай працы. Самыя значныя яго творы—паэмы "Новая зямля"і "Сымон- музыка", аповесці "Дрыгва", "На прасторах жыцця", трылогія "На ростанях".

Зараз мы зноў праверым свае веды. Адкажыце на пытанні.
1) Дзе нарадзіўся Якуб Колас?
2) Якое яго сапраўднае імя?
3) Чаму паэт выбраў сабе такі псеўданім?
4) У якім творы Якуб Колас апісаў сваё дзяцінства?
5) Як называўся першы верш паэта?
6) Назавіце найбольш значныя творы паэта?

Мы дайшлі да апошняй часткі нашага ўрока, якая змяшчае гульні і забаўлянкі. Зразумела, займальныя заданні гэтай старонкі будуць звязаны з жыццём і творчасцю Янкі Купалы і Якуба Коласа.

1. Крыжаванка. “ПШ” №7 2002, с.11
2. Рэбусы.
3. Прадоўжы верш.
4. Складзі назвы вершаў.
5. Злучы назву верша з іменем яго аўтара.
   *Я.Купала “У полі”, “Хлопчык і лётчык”.*
   *Я. Колас “На рэчцы зімою”, “Зайчыкі”, “Адлёт жураўлёў”.*

Знаёмства з кніжнай выставай.

5. **Падвядзенне вынікаў урока.**

Ці добра вы адчувалі сябе на сённяшнім уроку? Што асабліва запомнілася? Аб чым хацелі б расказаць сваім бацькам?

1. Сапраўднае імя Янкі Купалы Іван Дамінікавіч Луцэвіч. Нарадзіўся ён у вёсцы Вязынка ў сям’і арандатара. Арандатар—гэта чалавек, які бярэ зямлю ў карыстанне за пэўную плату, працуе на ёй, абрабляе, але гэта зямля не з’яўляецца яго ўласнасцю.

2. У ноч з 6 на 7 ліпеня адзначаецца свята Купалле. Іменна ў гэту ноч і нарадзіўся Іван Дамінікавіч Луцэвіч. Пазней, калі паэту спатрэбіўся псеўданім, ён выбраў гэты—Янка Купала.

3. У сямігадовым узросце Янка пайшоў у школу. Вучыўся Іван з задавальненнем і вялікім жаданнем.

4. Пасля заканчэння народнага вучылішча будучы паэт пачаў працаваць. Быў ён і хатнім настаўнікам, і перапісчыкам ў судовага следчага, і бібліятэкарам.

5. Першы верш Янкі Купалы называўся “Мужык”. Яго творы друкаваліся ў розных беларускіх газетах і часопісах. Выйшаў першы зборнік вершаў “Жалейка”.

6. Разам з Якубам Коласам Янка Купала стаў заснавальнікам Інстытута беларускай культуры. Яму было прысвоена званне народнага паэта Беларусі. Пазней Янка Купала быў абраны акадэмікам Акадэміі навук Беларусі.

1) Якуб Колас—гэта псеўданім паэта. Яго сапраўднае імя—Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. Нарадзіўся ён непадалёку ад Стоўбцаў у сям’і селяніна, які служыў лесніком у князя Радзівіла.

2) Раннія дзіцячыя гады прайшлі ў лесніковых сядзібах Ласток і Альбуць, што недалёка ад вёскі Мікалаеўшчыны.

3) У гэтым маляўнічым краі праходзілі маленства і юнацтва паэта. Тут упершыню адчуў ён гора народа, тут нарадзілася яго любоў да роднай зямлі. Свае дзіцячыя гады Якуб Колас апісаў у паэме “Новая зямля”.

4) Рана абудзілася ў хлопчыка цікавасць да кнігі. Пачатковую грамату ён набываў дома з дапамогай “дарэктара”, вясковага хлопца, які меў не надта багатыя веды. Пасля два гады вучыўся ў народнай школе вёскі Мікалаеўшчыны. Школа і кнігі прыносілі Кастусю шмат радасці. Кастанцін Міхайлавіч скончыў настаўніцкую семінарыю, бо з дзяцінства марыў стаць настаўнікам.

5) Пісаць вершы пачаў у дванаццацігадовым узросце. Калі Кастусь прачытаў адзін са сваіх першых вершаў “Вясна” бацьку, той сказаў: ”Добра,”—пацалаваў сына і даў яму рубель.

6) Колас любіў паэзію, усе вольныя хвіліны аддаваў літаратурнай працы. Самыя значныя яго творы—паэмы “Новая зямля”і “Сымон- музыка”, аповесці “Дрыгва”, “На прасторах жыцця”, трылогія “На ростанях”.